# Вобразы гераічнага часу

## Выстава плакатаў 1941-45 гадоў вяртае да вытокаў Перамогі

**Пётр Арэшка**

І формай, і зместам ваенныя плакаты вельмі адпавядалі таму гераічнаму часу. Да таго ж на выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі мы бачым не проста мастацкія творы, але і своеасаблівыя гістарычныя дакументы: яны нясуць у сабе подых той эпохі, водгулле вялікіх перамог. Як вядома, мастакі, што працавалі ў "баявым жанры", чуйна адклікаліся на галоўныя падзеі, а іх творы клікалі на абарону Айчыны.

Сумесны праект Міністэрства культуры, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і самой бібліятэкі прысвячаецца 65-годдзю Вялікай Перамогі. На адкрыцці выставы адзначалася: цяпер у сховах Нацыянальнай бібліятэкі налічваецца каля 200 плакатных лістоў 1941-45 гадоў выдання, і больш за 500 — у Музеі гісторыі вялікай Айчыннай вайны. А ў экспазіцыі прадстаўлена 70, толькі дзесятая іх частка. Яны розныя па форме, па тэматыцы — франтавой, тылавой, акупацыйнай, партызанскай. Ёсць і творы з шырока вядомай у тыя гады серыі "Окна ТАСС" і перыядычнай серыі блакаднага Ленінграда "Боевой карандаш". Купрыянаў, Крылоў, Сакалоў, Дэні, Таідзэ, Іваноў, Какарэкін, Карэцкі, Ватолін — гэтыя і іншыя прозвішчы вядомых савецкіх майстроў плакатнай графікі гучаць на выставе. Ёсць і плакаты беларускіх мастакоў С.Раманава і М.Гуцієва — яны працавалі ў тэматычнай плыні аднаўлення Мінска, праслаўлення подзвігаў беларускіх партызанаў.

На вернісажы выставы адбылася і прэзентацыя мультымедыйнага выдання "Паклонімся вялікім тым гадам", падрыхтаванага спецыялістамі бібліятэкі, выступалі творчыя калектывы. Цяпер госці маюць магчымасць пазнаёміцца і з шэрагам іншых юбілейных, тэматычных выстаў, прымеркаваных да Дня Перамогі і размешчаных па розных залах Нацыянальнай бібліятэкі.






Вобразная мова плакатаў ваеннага часу зразумелая і ветэранам, і моладзі